Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

1 ВЕРАСНЯ 2015 г. АЎТОРАК № 166 (28024) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## ВЕДЫ, КУЛЬТУРА І ДУХОЎНАСЦЬ — ГАРАНТЫЯ СТАБІЛЬНАСЦІ І РОСКВІТУ ДЗЯРЖАВЫ

*Навучэнцам, студэнтам, аспірантам, настаўнікам, навукова-педагагічным работнікам*

**Дарагія сябры!**

Віншую вас з Днём ведаў.

Добрая традыцыя — адзначаць першы дзень новага навучальнага года — аб'ядноўвае розныя пакаленні. Дарослым гэтае свята нагадвае пра школьныя і студэнцкія гады, старых таварышаў, шчаслівую пару дзяцінства і юнацтва. А для дзяцей і моладзі азначае чарговы крок да вяршынь ведаў, сустрэчу з сябрамі і любімымі настаўнікамі.

Але ў першую чаргу гэта свята першакласнікаў, бо кожны з нас праз усё жыццё праносіць успаміны аб тым дні, калі ўпершыню пераступіў школьны парог.

1 верасня — гэта цудоўная падстава выказаць словы ўдзячнасці педагогам, чыя прафесія аб'ядноўвае ў сабе найлепшыя чалавечыя якасці, а актыўная грамадзянская пазіцыя адыгрывае выключна важную ролю ў фарміраванні будучыні нашай краіны.

Веды, культура і духоўнасць — гарантыя стабільнасці і росквіту дзяржавы. Таму ў Беларусі робіцца ўсё магчымае, каб адукацыя была якаснай, даступнай і дапамагала кожнаму знайсці сваё месца ў жыцці.

Ад усёй душы зычу ўсім школьнікам і студэнтам, педагогам і бацькам, каб новы навучальны год стаў часам стварэння і натхнення, а кожны дзень вучобы і працы прыносіў радасць адкрыццяў і творчасці.

Са святам!

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

# ІНВЕСТЫЦЫІ Ў БУДУЧЫНЮ

**Краіна, якая не шкадуе сродкаў на адукацыю, можа быць упэўнена ў заўтрашнім дні**



Фота БЕЛТА.

**Стала ўжо добрай традыцыяй, што ў пачатку навучальнага года кіраўнік дзяржавы наведвае адну са школ. Учора Аляксандр Лукашэнка прысутнічаў на першым званку ў сярэдняй школе №56 горада Мінска.**

**Выступаючы перад вучнямі, педагогамі і бацькамі, Прэзідэнт адзначыў, што айчынная сістэма адукацыі мае высокі рэйтынг у свеце, яна канкурэнтаздольная. Сведчаннем высокага ўзроўню беларускай адукацыі служаць перамогі навучэнцаў і студэнтаў у міжнародных алімпіядах і конкурсах. Аляксандр Лукашэнка выказаў надзею, што з'явяцца таленты, якімі будзе ганарыцца Беларусь.**

СТАР. 2

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Анатоль КАЛІНІН, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«Мы павінны як мага больш будаваць арэнднага жылля, каб насельніцтва свабодна эмігравала да месцаў працоўных рэсурсаў. Людзі не павінны замацоўвацца там, дзе ёсць жыллё, але няма для іх працы. Павелічэнне аб'ёмаў арэнднага жылля дазволіць стаць грамадству больш мабільным. Арэндныя дамы карыстаюцца попытам у насельніцтва. Так, напрыклад, толькі ў Мінску каля 300 чалавек прэтэндуюць на адну кватэру, якая прадастаўляецца па камерцыйным найме. Сёлета ў краіне будаўніцтва арэнднага жылля захаваецца на ўзроўні мінулага года. Будзе ўведзена ў эксплуатацыю каля 185 тыс. кв м. Усяго ж у 2015 годзе плануецца ўвесці ў эксплуатацыю ў межах 4 млн кв. м жылля, у тым ліку за 1 млн 570 тыс. кв. м — з дзяржпадтрымкай».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 01.09.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 17452,00 | ▼ |
| Еўра | 19558,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 261,36 | ▼ |
| Укр. грыўня | 805,17 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

■ Свята

## ШЧУЧЫН — ГОРАД КНІЖНЫ

**На Дні беларускага пісьменства будуць прадстаўлены выданні, што выйшлі ў 2015 годзе. Паказаць будзе што...**

**Гэта больш за 5300 найменняў за першае паўгоддзе — лічба, якая дазваляе меркаваць, што гэты год не саступіць мінуламу ў актыўнасці беларускіх літаратараў і выдаўцоў. Учора на прэс-канферэнцыі, прысвечанай святу пісьменства, што адбудзецца 5-6 верасня ў Шчучыне, былі агучаны цікавыя лічбы беларускага кнігадрукавання і падрыхтоўкі горада да свята.**

Нягледзячы на тое, што колькасць асобнікаў выдадзеных кніг у 2015 годзе не падае, адзначаецца ўсё ж такі змяншэнне тыражных паказчыкаў. Затое гэтая з'ява не тычыцца літаратуры на беларускай мове — тут адбыўся агульны рост накладаў на 11,8%.

Правядзенне праекта нацыянальнага, і нават міжнароднага, маштабу — Дня беларускага пісьменства — узбагачае нашы гарады як духоўна, так і матэрыяльна. Сёлета на добраўпарадкаванне Шчучына, адкрыццё кніжнага магазіна «Несцерка», аднаўленне бібліятэкі, палаца Друцкіх-Любецкіх і іншае было выкарыстана каля 80 мільярдаў беларускіх рублёў. Адкрыццё новай кнігарні адбылося ўчора. **Міністр інфармацыі Рэспублікі Беларусь Лілія АНАНІЧ**, пабываўшы ў новай установе, з задавальненнем адзначыла яе сучаснасць і цікавасць да магазіна бацькоў і дзяцей.



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Між тым свята ў краіне пройдзе дваццаць другі раз, гэта значыць каля дваццаці ўзбагачаных ва ўсіх сэнсах гарадоў (некаторыя прымалі свята два разы).

СТАР. 3

## У ШКОЛАХ СТАНОВІЦЦА «ЦЕСНА»,

**але гэтая акалічнасць радуе — колькасць першакласнікаў прырастае**

**Амаль усе жыхары Беларусі лічаць 1 верасня святам. Пра гэта сведчаць вынікі нацыянальнага сацыялагічнага апытання, праведзенага Інфармацыйна-аналітычным цэнтрам.**

Дзень ведаў лічаць агульным святам для ўсіх грамадзян 40% рэспандэнтаў. І абсалютная большасць тых, у каго ёсць дзеці школьнага ўзросту (85% ад агульнай колькасці апытаных), пацвердзілі свой намер прысутнічаць на школьнай лінейцы ў Дзень ведаў.

Між іншым, у Савецкім Саюзе Дзень ведаў стаў афіцыйным святам толькі ў 1984 годзе. Пасля распаду Саюза яго паранейшаму адзначаюць у Расіі, Арменіі, Казахстане, Украіне, Малдове і Туркменістане. У большасці еўрапейскіх краін навучальны год таксама пачынаецца 1 верасня або ў першы панядзелак верасня: гэта Польшча, Чэхія, Францыя, Ірландыя, Бельгія, Эстонія, Літва, Венгрыя, Славенія.

Сёлета 1 верасня да заняткаў прыступяць 965 тысяч вучняў. Некалькі апошніх гадоў колькасць першакласнікаў у нашай краіне працягвала расці. Калі два гады таму ў першы клас прыйшлі па краіне крыху больш за 99,50 тысяч юных беларусаў, то ў гэтым годзе колькасць першакласнікаў павялічылася да 106,5 тысячы. Усё гэта прымушае развівацца і школьную інфраструктуру.

### «ВЯСЁЛКАВАЯ» ШКОЛА І 16 ПЕРШЫХ КЛАСАЎ

Па традыцыі к 1 верасня ў краіне адкрываюцца некалькі новых школ. Адна з іх — у сталічным мікрараёне «Лебядзіны». Школа разлічана на 1020 вучняў і складаецца з трох блокаў. У адным з іх размесцяцца школьнікі малодшых класаў, у другім — старшых. А ў цэнтральнай частцы — адміністрацыйныя памяшканні, сталовая, бібліятэка, дзве спартыўныя і адна трэнажорная залы, а таксама зала харэаграфіі і некалькі камп'ютарных класаў.

СТАР. 2